Наталя Тагановіч

# БЕЛАРУСКІ ПАЛІЎНА-ЭНЭРГЕТЫЧНЫ КОМПЛЕКС І ЯГО ЗАЛЕЖНАСЬЦЬ АД РАСІЙСКІХ ЭНЭРГАНОСЬБІТАЎ

## (аналіз крыніцаў паставак энэргіі на беларускі рынак у 1991—2001 гг.)

У цяперашні час беларускі энэргетычны комплекс уключае здабычу торфу і вытворчасьць торфабрыкетаў, нафтаздабычу і нафтаперапрацоўку, разгалінаваную сетку газаправодаў, нафта- і нафтапрадуктаправодаў, а таксама галіну электраэнэргетыкі. Асноўныя фонды галінаў паліўна-энэргетычнага комплексу (ПЭК) складаюць каля 25% вытворчых фондаў прамысловасьці. Штогадовыя выдаткі на энэрганосьбіты пры вытворчасьці прадукцыі й аказаньні паслуг у агульных выдатках па ўсёй нацыянальнай гаспадарцы ўзрасьлі з 5% у 1990 г. да 33% у 1995 г. і працягваюць заставаца на такім высокім узроўні. Штогод Беларусі даводзіцца плаціць за імпартаваныя энэрганосьбіты каля 1,5 млрд. дал. ЗША. Цягам апошняга дзесяцігодзьдзя найважнейшымі праблемамі ПЭК былі:

— недастатковасьць уласнай рэсурсавай базы для поўнага задавальненьня патрэбаў краіны ў энэрганосьбітах;

— адсутнасьць дывэрсыфікацыі паставак ад вонкавых крыніцаў;

— высокі кошт імпартаваных энэрганосьбітаў;

— рост долі зношаных, маральна перастарэлых асноўных фондаў;

— недасканаласьць мэнэджмэнту на прадпрыемствах;

— недасканаласьць нарматыўна-праўнай і заканадаўчай базы функцыянаваньня галінаў ПЭК;

— сыстэмны фінансавы крызыс, выкліканы масавымі неплацяжамі спажыўцоў за паліва і энэргію і, як вынік, інвэстыцыйны крызыс, які не дазваляе забясьпечыць мадэрнізацыю маральна і фізычна перастарэлых тэхналёгіяў і

абсталяваньня.

Рэспубліка Беларусь ня мае ўласнай значнай паліўна-сыравіннай базы, якая б цалкам задавальняла патрэбы эканомікі ў першасных энерганосьбітах, і вымушана ўвозіць больш як 80% іх з-за мяжы.

Асноўнымі тутэйшымі відамі энэргарэсурсаў ёсьць паліўны торф, нафта і газавы кандэнсат, сухі газ, дровы і драўняныя адкіды, ёсьць запасы гаручых сланцаў і бурага вугалю.

На мал. 1 паказана дыяграма структуры тутэйшых відаў паліва ў дынаміцы па гадох. Зь яе відаць, што цягам 1995—1999 гг. агульнае выкарыстаньне тутэйшых відаў паліва заставалася практычна на адным узроўні, як і доля тутэйшых энэргарэсурсаў у агульным аб'ёме спажытых паліўна-энэргетычных рэсурсаў (каля 14,5—16%). Значныя зьмены адбыліся ў структуры выкарыстоўваных тутэйшых відаў паліва. Скарацілася доля паліўнага торфу, нафты і газавага кандэнсату, сухога газу, узрасло выкарыстаньне дроваў і драўняных адкідаў. Зьніжэньне выкарыстаньня паліўнага торфу ў гэты пэрыяд зьвязана са скарачэньнем аб'ёмаў вытворчасьці тарфяных брыкетаў дзеля высіленьня эксплюатацыйных запасаў на адведзеных плошчах сыравінных базаў торфабрыкетных заводаў і нясвоечасовым разьвязаньнем абласнымі і раённымі адміністрацыямі пытаньняў што да адводу земляў.

Мал.1. Спажываньне тутэйшых відаў паліва, тыс. т ум. паліва




Памяншаецца ступень задавальненьня патрэбаў народнай гаспадаркі Беларусі ў маторных відах паліва за кошт уласнай нафтавай сыравіны. Спажываньне беларускай нафты і газавага кандэнсату за пэрыяд 1995—1999 гг. скарацілася на 14% з прычыны зьніжэньня аб'ёмаў здабычы, бо выведаныя буйныя радовішчы знаходзяцца ў заключнай стадыі разрабленьня,





а новым радовішчам уласьцівы малыя памеры і невялікія запасы. Гэтыя запасы адносяцца да цяжкавыманых, і дзеля гэтага для здабычы гэтай нафты патрабуюцца найноўшыя тэхнічна-тэхналягічныя сродкі.

З прычыны аб'ектыўнага скарачэньня паліўнага торфу і газавага кандэнсату ў структуры выкарыстаньня мясцовых відаў паліва акцэнт рабіўся на павышэньне ўзроўню выкарыстаньня драўнянага паліва і дроваў. Згодна з пастановай Прэзыдыюму Рады Міністраў Рэспублікі Беларусі (ад 13 студзеня 1998 г.), была разробленая й рэалізуецца "Праграма выкарыстаньня драўнянай сыравіны для атрыманьня цеплавой энэргіі". У выніку актывізацыі выкарыстаньня дроваў і драўняных адкідаў у якасьці паліва для атрыманьня цеплавой энэргіі іх доля ў паліўным балянсе краіны цягам 1995—1999 гг. узрасла ў 2 разы.

Дарма што на тэрыторыі краіны каля места Жыткавічы ёсьць невялікае радовішча бурага вугалю аб'ёмам 150 млн. т, а ў раёне местаў Любань і Тураў выведаны запасы гаручых сланцаў ў аб'ёме 2 млрд. т, здабыча вугалю і сланцаў пры існай тэхналёгіі эканамічна нявыгадная.

Слабая сыравінная база й абмежаваныя інвэстыцыйныя магчымасьці паліўназдабыўчных прадпрыемстваў не дазваляюць значна павялічыць долю тутэйшых відаў паліва ў агульным аб'ёме спажываньня энэргарэсурсаў.

Нястача паліва для поўнага задавальненьня патрэбаў краіны кампэнсуецца палівам і энэргіяй з Расійскай Фэдэрацыі. Залежнасьць паліўна-энэргетычнага комплексу ад імпарту акурат расійскіх энерганосьбітаў склалася гістарычна. Да здабыцьця Беларусяй незалежнасьці ў 1991 г. станаўленьне і разьвіцьцё беларускай энэргасыстэмы й паліўнай прамысловасьці ішло ў рамках энэргетычнай праграмы СССР (1983 г.), якая прадугледжвала наступныя кірункі разьвіцьця ПЭК — інтэнсіўнае энэргазьберажэньне і пераарыентацыю з нарошчваньня здабычы нафты і газу на пераважнае разьвіцьцё атамнай энэргетыкі й вугальнай прамысловасьці. У адпаведнасьці з гэтымі кірункамі прадугледжвалася разьвіцьцё энэргетыкі Рэспублікі Беларусі — будаўніцтва АЦЭЦ і АЭС, нязначнае разьвіцьцё энэргакрыніцаў (ЦЭЦ, кацельных) на арганічным паліве. Пачалося будаўніцтва Менскай АЦЭЦ электрычнай магутнасьцю 2 млн. кВт і плянавалася ўзьвядзеньне Беларускай АЭС — магутнасьцю 6 млн. кВт. Такая канцэпцыя амаль цалкам разьвязвала праблему доўгатэрміновага задавальненьня краіны энерганосьбітамі без істотнага прыросту спажываньня арганічнага паліва.

Аднак па аварыі на Чарнобыльскай АЭС было пастаноўлена спыніць будаўніцтва Менскай АЦЭЦ і ўсей работы для выбудовы Беларускай АЭС, што прывяло да арыентацыі паліўна-энэргетычнага комплексу краіны на выкарыстаньне арганічнага паліва — нафты і газу. У гэты самы пэрыяд (канец 1970-х — пачатак 1980-х гадоў) інтэнсіўны эканамічны рост прыводзіць да значнага павелічэньня спажываньня паліўна-энэргетычных рэсурсаў. Як вынік, з 1982 г. беларуская энэргасыстэма становіцца дэфіцытнай. У 1990 г. забясьпечанасьць краіны ўласнымі паліўнымі рэсурсамі склала 13%, забясьпечанасьць

электраэнэргіяй за кошт уласных крыніцаў — 80%. Рэсурсная база комплексу амаль цалкам фармуецца за кошт увозу першасных энэргарэсурсаў (нафты, газу і вугалю) з асноўнага нафтагазавага рэгіёну Расіі — Заходне-сібірскага. У рамках Энэргапраграмы СССР ідзе стварэньне адзінай сыстэмы магістральных і лякальных нафта- і газаправодаў для пастаўкі нафты і газу ў рэспублікі Саюзу і на экспарт у краіны Заходняй Эўропы. Нястача электраэнэргіі цалкам пакрываецца пастаўкамі ў межах адзінай энэргасыстэмы СССР па міжсыстэмных сувязях з Расіяй, Літвой, Украінай. Будаўніцтва высакавольтных лініяў электраперадачаў Ігналінская АЭС — ПС “Беларуская” (на напружаньне 330 кВ), ВЛ 750 кВ Смаленская АЭС (Расія) — ПС “Беларуская” ставарае надзейнае і бесьперабойнае электразабесьпячэньне Беларусі.

Фармаваньне паліўна-энэргетычнага комплексу Беларусі да 1990 г. у складзе паліўна-энэргетычнага комплексу СССР абумовіла схему разьмяшчэньня і выбар магутнасьцяў генэруючых крыніцаў у электраэнэргетыцы і прадпрыемствах па нафтаперапрацоўцы ў паліўнай прамысловасьці. Калі ўвод магутнасьцяў на ЦЭЦ і ДРЭС вызначаўся попытам на электра- і цеплаэнэргію ўнутры краіны, то месцазнаходжаньне і магутнасьць двух нафтаперапрацоўчых заводаў залежалі найперш ад умоваў эканамічнай і транзытнай прывабнасьці экспарту нафтапрадуктаў на захад Эўропы.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства “Наваполацкае вытворчае аб’яднаньне “Нафтан” (РУП ВА “Нафтан”) — першынец нафтаперапрацоўчай прамысловасьці Беларусі. Першая чарга заводу запушчана ў 1963 г. З праектнай магутнасьцю 25 млн. т нафты ў год ён належыць да ліку найбуйнейшых ня толькі ў СНД, але і ў Эўропе. Будаўніцтва заводу на поўначы Беларусі абгрунтоўвалася патрэбамі прылеглых абласьцей нашай дзяржавы, Прыбалтыкі, Расіі, а таксама экспартнымі магчымасьцямі. Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод быў задуманы й пабудаваны паводле тэхналягічнай схемы паліўнага варыянту нафтаперапрацоўчага заводу. Аснову заводу склалі ўстаноўкі першаснай ачысткі нафты, гідраачысткі, каталітычнага рыфармаваньня бэнзынаў. З часам у аб’яднаньні разьвіліся й іншыя кірункі нафтаперапрацоўкі. Гэта ўстаноўкі па вытворчасьці араматыкі, комплекс па вытворчасьці змазачных аліваў, устаноўкі па вытворчасьці прысадак да аліваў, бітумныя ўстаноўкі. Асноўны комплекс тэхналягічных установак аб’яднаньня пабудаваны ў 70-я гады, затым рэканструяваны і набліжаны да сучасных стандартаў тэхналягічных працэсаў. Да пачатку 90-х гадоў завод дасягнуў магутнасьці ў перапрацоўцы нафты ў 25 млн. т у год. Ён ёсьць прадпрыемствам паліўна-араматычнага профілю з глыбінёй перапрацоўкі нафты 64—65% (з улікам вырабу змазачных аліваў), выпускае больш за 75 найменьняў прадукцыі. Першасная перапрацоўка нафты ў 1999 г. склала 6,069 млн. т (98% адносна 1998 г.). Асноўнай прадукцыяй прадпрыемства ёсьць бэнзін (А-92, А-76 і прамагонны), дызэльнае паліва, мазута, алівы, араматычныя вуглевадароды, нафтабітум. Ад бальшыні нафтаперапрацоўчых заводаў адрозьніваецца





вырабам шырэйшай гамы прадуктаў нафтахіміі. Для прыёму й захоўваньня сыравіны й нафтапрадуктаў пабудаваная й дзеіць магутная таварна-сыравінная база з рэзэрвуарамі ёмістасьцю 5, 10, 20 тыс. тон. Нафта паступае ў аб’яднаньне па нафтаправодзе “Дружба”. Адгрузка прадукцыі адбываецца чыгуначным і аўтамабільным транспартам, а таксама па прадуктаправодах. Уласьнікам РУП ВА “Нафтан” на цяперашні момант ёсьць дзяржава.

Адкрытае акцыянэрнае таварыства “Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод” (ААТ “Мазырскі НПЗ”) разьмешчанае на поўдні Рэспублікі Беларусі, у Гомельскай вобласьці. Таму традыцыйнымі рынкамі збыту для заводу былі паўночныя вобласьці Ўкраіны, заходняя ўскраіна Расіі, поўдзень Беларусі, Польшча і Чэхія. Сыстэма прадуктаправодаў забясьпечвае выхад нафтапрадуктаў у краіны Ўсходняй Эўропы. Нафта паступае на завод па двух нафтаправодах: расійская нафта — па нафтаправодзе “Дружба” і беларуская нафта — з рэчыцкіх радовішчаў. Мазырскі НПЗ уведзены ў дзеяньне ў студзені 1975 г.

Ад пачатку на заводзе ўсталявалі нафтаперапрацоўчыя комплексы ЛК-6У, прызначаныя для вытворчасьці газы, нізкаактанавых бэнзынаў і мазуты для кацельных і аўтатрактарнай тэхнікі айчыннай вытворчасьці, у адрозьненьне ад Омскага ці Яраслаўскага нафтаперапрацоўчых заводаў, абсталяваных устаноўкамі каталітычнага крэкінгу, здольных рабіць глыбокую перапрацоўку нафты. Да канца 70-х прадукцыйнасьць Мазырскага НПЗ дасягнула 16 мільёнаў тон нафты ў год. У 80-я гады з будаўніцтвам трох новых установак завод пашырыў сваю профільнасьць вырабам вадкіх парафінаў, бэнзолу і рэгенэрацыяй сернай кісьлі. Неўзабаве значную частку гэтых магутнасьцяў давядзецца згарнуць, папершае, дзеля адсутнасьці ранейшых аб’ёмаў пастаўкі сыравіны для перапрацоўкі, па-другое, дзеля фінансавай нястаннасьці спажыўцоў прадукцыі, у прыватнасьці заводаў кармавых дрожджаў, на якія арыентавалася магутная вытворчасьць вадкіх парафінаў. Надзею на выжываньне заводу пакідаў толькі асноўны від дзейнасьці — вытворчасьць паліва. Зь дзьвюх дзейных установак ЛК-6У адну на пачатку 90-х давялося спыніць. Магутнасьці другой выкарыстоўваліся для перапрацоўкі толькі крыху больш як 6 млн. т нафты за год. Маючы простую тэхналягічную схему, завод выпрабляў 52% сьветлых нафтапрадуктаў, 48% складалі мазута і бітум. Пры гэтым якасьць бэнзынаў была невысокай.

Беручы пад увагу, што цяперашнім часам патрэба Беларусі ў нафце не перавышае 7—8 млн. т у год, абодва заводы амаль палову нафтапрадуктаў экспартуюць.

Беларуская электраэнэргетычная сыстэма найбольш інтэнсіўна разьвівалася ў 1970—1980 гадох. Былі пушчаныя ў лад Бярозаўская ДРЭС, Аршанская ЦЭЦ, Наваполацкая ЦЭЦ, Магілёўская ЦЭЦ-2, Лукомская ДРЭС, Менская ЦЭЦ-3 і Менская ЦЭЦ-4, уведзена ў эксплюатацыю высакавольтная лінія электраперадачаў 330кВ Менск—Вільня, якая ўлучыла беларускую энэргасыстэму ў Аб’яднаную энэргетычную сыстэму Паўночнага Захаду СССР, г.зн. у адзіную энэргетычную сыстэму эўрапейскай часткі СССР. Характэрнай рысай беларускай энэрга-

сыстэмы ёсьць выраб электраэнэргіі пераважна па цеплафікацыйным цыкле, што дае высокую эканамічнасьць вытворчасьці электрычнай і цеплавой энэргіі. Доля цеплаэнэргацэнтраляў (ЦЭЦ) у агульным аб'ёме ўстаноўленай магутнасьці ў энэргасыстэме складае больш за 55%. Цяпер энэргасыстэма здольная цалкам забясьпечваць патрэбы краіны ў электрычнай энэргіі й на 50% — у цяпле.

Пасьля распаду СССР нафтаперапрацоўчыя заводы і ўсе прадпрыемствы беларускай энэргетычнай сыстэмы пераходзяць у дзяржаўную ўласнасьць Рэспублікі Беларусі, а нафта, газ і электраэнэргія пачынаюць імпартавацца з Расіі.

З улікам амаль поўнай залежнасьці краіны ад імпарту энэрганосьбітаў з адной дзяржавы — Расіі — у мэтах энэргетычнай бясьпекі дзяржавы распрацоўваліся альтэрнатыўныя варыянты энэргазабесьпячэньня. Варыянты газазабесьпячэньня з радовішчаў Паўночнага мора, з Ірану праз Азэрбайджан і Ўкраіну, а таксама звадкаванага прыроднага газу зь дзяржаваў-экспарцёраў (Альжыр, Лібія, ААЭ, Брунэй і інш.) малаімаверныя дзеля неабходнасьці вялізных інвэстыцыяў у транспартную інфраструктуру і наступных вялікіх выдаткаў на транспартаваньне. Рэальна магчымым варыянтам выглядае імпарт газу з Цэнтральнай Азіі (маецца на ўвазе Туркмэнія), які тэхнічна рэалізоўваецца ў кароткія тэрміны пры адносна невялікіх інвэстыцыях пры максымальным выкарыстаньні ўжо існай сеткі газаправодаў. Туркмэнскі ўрад актыўна шукае магчымасьці самастойнага экспартаваньня газу ў іншыя дзяржавы, бо выведаныя запасы складаюць каля 3 трлн. куб.м, геалягічныя — 15—20 трлн. куб.м, што забясьпечвае Туркмэністану выхад у лік найбуйнейшых пастаўнікоў прыроднага газу на сусьветным рынку. Улічваючы існую сытуацыю з цэнамі на прыродны газ, калі кошт расійскага газу на мяжы зь Беларусяй складае 30 дал. ЗША/тыс. куб.м, а туркмэнскага — ацэньваецца ў 80 дал. ЗША/тыс. куб.м, з эканамічных меркаваньняў выкарыстаньне турмэнскага газу нявыгаднае. Аднак варта пільна адсочваць тэндэнцыю зьмяненьня гэтых цэнаў, бо існуе верагоднасьць сытуацыі, калі цэны стануць супастаўнымі, а варыянты паставак з Расіі і Туркмэністану — роўнаэканамічнымі.

Неабходнасьць дывэрсыфікацыі паставак газу абумоўленая ня столькі эканамічнымі паказьнікамі, колькі ўмовамі энэргетычнай бясьпекі, бо ў выпадку абмежаваньня паставак ПЭК краіна пацерпіць шкоду ў выглядзе недавытворчасьці ВУП у памеры 347 дал. ЗША/т у.п. (на ўзровень 1999 г.), што шматкроць перавышае кошт недапастаўленых энэрганосьбітаў і дае арыенцір для пошуку альтэрнатыўных паставак або стварэньня рэзэрваў ПЭК.

Для забесьпячэньня Беларусі, якая месьціцца ў цэнтры ўсходнеэўрапейскага рэгіёну і ня мае выхаду да мора, нафтай, апрача шляху з Расіі й Казахстану па існай сыстэме магістральных нафтаправодаў разглядаўся варыянт паставак праз тэрыторыі сумежных дзяржаваў (Украіна, Летува, Латвія, Польшча), якія маюць або ствараюць комплексы для прыёму нафты з танкераў, пры гэтым рэалізуецца камбінаваная трубаправодна-марская транспартная схема пастаўкі нафты альбо чыгуначна-марская. Пастаўнікамі могуць быць краіны-экспарцёры нафты, якія





вядуць здабычу як у раёнах Паўночнага мора (Англія, Нарвэгія), так і ў зоне Пэрсыдзкай затокі (краіны Бліжняга і Сярэдняга Ўсходу).

Дарма што адлегласьць да Беларусі ад радовішчаў Паўночнага мора меншая, чымся ад рэгіёну Пэрсыдзкай затокі, наяўныя там запасы недастатковыя нават для забесьпячэньня найбліжэйшых краінаў Заходняй Эўропы. З улікам таго, што выведаныя запасы нафты ў краінах Бліжняга і Сярэдняга Ўсходу больш як у два разы перавышаюць запасы ўсіх астатніх радовішчаў на Зямлі, а таксама ў сувязі з наяўнасьцю стабільных грузапатокаў нафты з гэтых краінаў у Эўропу, для Рэспублікі Беларусі ў якасьці асноўнага альтэрнатыўнага варыянту варта разглядаць пастаўкі нафты з гэтага рэгіёну двума шляхамі:

паўднёвы — праз Адэсу;

паўночны — праз Ратэрдам.

У Ратэрдаме неабходна чыніць перагрузку нафты з танкераў дэдвэйтам 200—500 тыс. тон у танкеры дэдвэйтам да 60 тыс. тон для наступнай перавозкі яе ў парты Балтыйскага мора (Вэнтспілс, Бутынге, Гданьск, Ростак). У сваю чаргу, транспарт з партоў да НПЗ краіны забясьпечваецца трубаправодамі пры максымальным выкарыстаньні наяўных сыстэмаў. Агулам разгледжана 5 асноўных варыянтаў на агульны аб'ём пастаўкі 21 млн. т у год.

Пры адсутнасьці расійскай нафты на ўмовах узаемазамяняльнасьці па крытэры мінімуму выдаткаў аптымальным з альтэрнатыўных ёсьць паўднёва-заходні варыянт па схеме Адэса—Броды—Мазыр—Бабовічы—Касьцюковічы—Полацак з будаўніцтвам участку 183 км Бабовічы-Касьцюковічы. З агульнай колькасьці ў 21 млн. т у год 12 пойдзе на Наваполацкі НПЗ і 9 — на Мазырскі НПЗ.

Для гэтага варыянту патрабуецца 80,3 млн. даляраў ЗША, а выдаткі на дастаўку нафты складацьмуць 33,9 даляра ЗША за тону.

Для рэалізацыі паўночнага варыянту патрабуецца 173,5 млн. даляраў ЗША інвэстыцыяў, а за дастаўку 1 т нафты — 48,7 даляра ЗША. Варта ўлічыць, што выдаткі на дастаўку нафты па разгледжаных варыянтах разьлічаныя без уліку будаўніцтва новых транспартных камунікацыяў на тэрыторыях сумежных дзяржаваў, прыкладам, нафтатэрміналы ў Адэсе і Бутынге, нафтаправоды Адэса-Броды, Бутынге-Мажейкяй. Стварэньне дадатковых магутнасьцяў з улікам патрэбаў Рэспублікі Беларусі запатрабуе, апроч прыняцьця палітычнага рашэньня, значных капіталаўкладаньняў у выглядзе долевага ўдзелу ў будаўніцтве гэтых аб'ектаў. Калі ўлічыць, што на 1.03.2000 г. кошт сырой нафты ў портах Пэрсыдзкай затокі знаходзіцца на ўзроўні 117—121 даляраў ЗША за тону, дык з улікам транспартных выдаткаў кошт адной тоны нафты для краіны па паўднёва-заходнім варыянце без прыцягненьня расійскай нафты складзе 151—155, з прыцягненьнем — 146—150 даляраў ЗША, па паўночным — 166—170 даляраў ЗША. Для параўнаньня — кошт нафты з Расіі у 1996-1998 гг. складаў 80—87 даляраў ЗША за тону, а на пачатку 1999 г. было рэзкае падзеньне да 45—47 даляраў ЗША за тону, затым інтэнсіўны рост да 115—120 даляраў ЗША за тону. З гэтага вынікае, што ўсе раз-

гледжаныя альтэрнатыўныя варыянты па ўзроўні цэнаў цяпер даражэйшыя за пастаўкі з Расіі амаль удвая. Калі ўявіць, што Расія потым будзе прадаваць нафту за мяжу па сусьветных цэнах, то ў гэтым выпадку яе кошт у краіне будзе таньнейшы за альтэрнатыўныя варыянты на велічыню транспартных выдаткаў.

У вуглезабясьпячэньні пры існых аб'ёмах спажываньня вугалю (1999 г. — 0,49 млн. т у. п.) адсутнічае манаполія аднаго пастаўніка, бо патрэбы краіны задавальняюцца за кошт Украіны на 50%, Расіі — 30%, Казахстану — 11%, Польшчы й іншых — 9%. У якасьці альтэрнатыўных варыянтаў разглядаліся пастаўкі з Польшчы, а таксама з Паўднёвай Афрыкі й Аўстраліі праз парты Балтыйскага мора. Выдаткі на дастаўку аўстралійскага і паўднёваафрыканскага вугалю ў Эўропу (Ратэрдам) складаюць 7—10 даляраў ЗША/т у.п., а з улікам дастаўкі ў краіну гэтая велічыня ацэньваецца ў 11—14 даляраў ЗША/т у.п.

Як вынік, для краіны цэны на вугаль складуць (у далярах ЗША /т у.п.):

- расійскі — 28—32;
- польскі — 34—37;
- паўднёваафрыканскі — 41—45;
- аўстралійскі — 45—49.

З вышэйменаванага відаць, што найвыгаднейшы варыянт атрыманьня вугалю з Расіі, а з альтэрнатыўных — з Польшчы на базе стварэньня сумеснага прадпрыемства.

Разгледжаныя варыянты паказваюць, што эканамічна мэтазгодна імпартаваць энэргарэсурсы з Расіі.

У адрозьненьне ад беларускага энэргетычнага комплексу паліўна-энэргетычны комплекс Расіі ня толькі цалкам забясьпечвае патрэбы краіны ў энэргарэсурсах, але і значную частку (каля 30%) экспартуе ў рэспублікі былога СССР і ў засталы сьвет. У першай палове 1990-х гадоў эканамічныя рэформы, лявінападобная прыватызацыя прадпрыемстваў ПЭКу, ваганьні сусьветных цэнаў на энэрганосьбіты выклікалі глыбокія зьмены ў гандлі энэргарэсурсамі Расіі з усімі краінамі СНД, у тым ліку і зь Беларусяй.




Мал. 2. Дынаміка імпарту электраэнэргіі





У Беларусь у 1995 годзе пастаўлена ў параўнаньні з 1991 годам нафты менш утрая, прыроднага газу — на 12%. Галоўная прычына зьніжэньня аб'ёму паставак ПЭК — скарачэньне попыту на іх унутры краіны з-за падзеньня вытворчасьці і высокая запазычанасьць за пастаўленыя энэргарэсурсы. Эканамічны рост у Беларусі, які пачаўся у 1996 годзе, прывёў да павелічэньня імпарту энэрганосьбітаў з Расіі (мал. 2, 3, 4). У выніку імпарт у 2000 годзе ў параўнаньні з 1995 годам павялічыўся: электраэнэргіі — на 19%, прыроднага газу — на 26%, нафты — на 4%. Стабілізацыі паставак спрыяў штогодні "Адзіны баланс паліўна-энэргетычных рэсурсаў Саюзнай дзяржавы", які ўключае балансы па нафтавай сыравіне, аўтамабільным бэнзыне, дызэльным паліве, мазуце, рэактыўным паліве, прыродным газе, вугалі, электрычнай энэргіі, звадкаваным газе. Дарма што адзіны баланс — рамачны дакумэнт, які агаворвае стратэгію паставак ПЭК, ён выступае асновай пры падпісаньні кантрактаў і ўгодаў паміж суб'ектамі гаспадараньня абедзьвюх дзяржаваў.

Структура імпарту паставак паліўна-энэргетычных рэсурсаў на працягу апошняга дзесяцігодзьдзя стабільная, а нязначныя зьмены ідуць у бок павелічэньня долі паставак з Расіі й скарачэньня — зь іншых дзяржаваў.

Значна павялічыўся аб'ём імпарту электраэнэргіі (мал. 2) з Расіі (у 2,5 разу цягам 1991—2000 гадоў), якая пастаўляецца пераважна са Смаленскай АЭС па ВЛ 750 кВ Смаленская АЭС — ПС "Беларуская". З экалягічнага гледзішча экспарт электраэнэргіі Расіі нявыгадны, бо прыводзіць да дадатковага засьмечваньня ўласнага асяродзьдзя. У гэтым сэнсе лягічней экспартаваць першасныя энэргарэсурсы, зь якіх у краіне-імпартэры будуць выпрабляць электраэнэргію. З эканамічнага гледзішча, зважаючы на суадносіны тарыфаў на электраэнэргію ў апошнія гады, Расіі выгадна прадаваць яе як можна болей. У параўнаньні з краінамі Заходняй Эўропы тарыфы на электраэнэргію ў Расіі для прамысловасьці меншыя ў 1,5—2,5 разу, а для насельніцтва — у 6—9,4 разу. Нягледзячы на дастатковую наяўнасьць магутнасьцяў для выпрацоўкі электраэнэргіі й пакрыцьця патрэбаў нашай краіны ў гэтым відзе энэргарэсурсаў, Беларусі выгадней яе імпартаваць, бо кошт за 1 кВт/гадз на расійскую электраэнэргію значна ніжэйшы, чымся на вып-




Мал. 3. Дынаміка імпарту нафты



Мал.4. Дынаміка імпарту прыроднага газу

рацаваную ў беларускай энэргасыстэме.

Павялічваецца доля расійскай электраэнэргіі ў агульным аб’ёме яе імпарту — з 22,5% у 1991 годзе да 80% — у 2000 годзе. Гэта выклікана скарачэньнем экспарту электраэнэргіі з Ігналінскай АЭС (Літва). Калі ў 1991 годзе зь літоўскай энэргасыстэмы было пастаўлена 9,7 млрд. кВт/гадз, то ў 2000 — менш за 2 млрд. кВт/гадз. Пераарыентацыя беларускай энэргасыстэмы на імпарт расійскай электраэнэргіі абумоўлена найперш прывабнасьцю схемы разьлікаў за пастаўленую электраэнэргію. Кампанія “Летувас энэргія” патрабуе 100% аплаты за прадукцыю ў грашовай форме і нават пры нязначным парушэньні графіку разьлікаў адразу скарачае ці цалкам спыняе пастаўкі электраэнэргіі ў краіну. Расійскі бок — РАТ “ЕЭС Росии” — аплату бягучага спажываньня і запазычанасьць за пастаўленую ў краіну электраэнэргію прымае па мяшанай схеме: 70% аплачваецца прадукцыяй матэрыяльна-тэхнічнага прызначэньня беларускіх прадпрыемстваў-вытворцаў і 30% у грашовай форме, у некаторыя пэрыяды доля бартэру дасягала 100%. Нерытмічнасьць аплаты за электраэнэргію беларускім бокам не адбівалася на бесьперабойнасьці электразабесьпячэньня.

Павелічэньне паставак прыроднага газу выклікана скарачэньнем аб’ёму выкарыстаньня мазуты пры вытворчасьці электра- і цеплаэнэргіі на генэруючых крыніцах беларускай энэргасыстэмы. Апроч таго, больш хуткімі тэмпамі (на 13% за пэрыяд 1995—1999 гг.) ідзе выкарыстаньне газу ў якасьці сыравіны для перапрацоўкі і ў іншыя віды паліва, на вытворчасьць хімічнай і нафтахімічнай ды іншай няпаліўнай прадукцыі.

Павольнымі тэмпамі павялічваюцца аб’ёмы імпарту нафты. Адна з асноўных прычынаў — нафту краіна атрымлівае па сусьветных цэнах (з розьніцай толькі ў 10 дал. ЗША/т), у адрозьненьне ад прыроднага газу і электраэнэргіі, якія пастаўляюцца па цэнах, значна ніжэйшых за сусьветныя. Беларускі бок у асобе канцэрну “Белнафтахім” увесь час вядзе перамовы з расійскімі пастаўнікамі, каб





зьнізіць цэны на нафту. Аднак прыватныя нафтавыя кампаніі, зацікаўленыя ў атрыманьні найбольшага прыбытку, на саступкі не ідуць. У выніку расійскія нафтапрадукты таньнейшыя за беларускія прыблізна ўдвая. Але нават калі цана нафты для расійскіх і беларускіх вытворцаў стане роўнай, кошт беларускіх нафтапрадуктаў з-за вышэйшага падатковага складніку ўсё адно будзе вышэйшы на 0,03 дал. ЗША/літар. Другая прычына — марудныя тэмпы рэканструкцыі беларускіх НПЗ для павышэньня канкурэнтаздольнасьці беларускіх нафтапрадуктаў на замежных рынках на аснове павелічэньня глыбіні перапрацоўкі нафты.

Агараць рэканструкцыю і мадэрнізацыю двух нафтаперапрацоўчых заводаў уласнымі сіламі немагчыма. Аднак працэс прыцягненьня замежных інвэстыцыяў ідзе марудна з-за зацягнутай структурнай перабудовы ў нафтавым комплексе.

У адрозьненьне ад Беларусі, у Расіі ў часе эканамічнай рэформы першай паловы 90-х гадоў адбылася ломка аджылых галіновых формаў кіраваньня ў нафтавым комплексе. Стварэньне ў яго складзе буйных вэртыкальна інтэграваных кампаніяў, якія ахопліваюць увесь вытворчы цыкль ад здабычы нафты да рэалізацыі нафтапрадуктаў, дазволіла павялічыць манэўранасьць комплексу і ягоную здольнасьць адптавацца да вонкавых узьдзеяньняў. У рамках вэртыкальна інтэграванай кампаніі зьявілася магчымасьць многія нэгатыўныя працэсы ў асобных элемэнтах тэхналягічнага ланцужка пераадольваць зь мінімальнымі выдаткамі. Напрыклад, зьніжэньне ўзроўню здабычы нафты кампэнсуецца паглыбленьнем яе перапрацоўкі, што ў сучасных умовах эфэктыўнейшае за ўкладаньне інвэстыцыяў у разьвіцьцё сыравіннай базы (выдаткі на атрыманьне дадатковай колькасьці маторнага паліва за кошт павышэньня адбору сьветлых нафтапрадуктаў у 2-3 разы меншыя за ўкладаньні ў разьвіцьцё альтэрнатыўнае здабычы). Эфэктыўнасьць функцыянаваньня вэртыкальна інтэграванай кампаніі забясьпечваецца рацыяналізацыяй усяго тэхналягічнага ланцужку “нафтавая сьвідравіна — нафтаправоды — НПЗ — бэнзакалёнкі”. З прычыны зьніжэньня нафтаздабычы ў Расіі расійскія вэртыкальна інтэграваныя кампаніі актывізавалі сваю прысутнасьць на беларускім рынку нафтапрадуктаў.

У цяперашні момант на расійскім рынку створана 12 буйных вэртыкальна інтэграваных кампаніяў. Група “ЛУКОЙЛ” першай зь іх прыйшла працаваць у Беларусь.

“ЛУКОЙЛ” складаецца з холдынгавай кампаніі, шасьці нафтаздабыўных прадпрыемстваў, двух НПЗ, мае сетку гандлёва-збытавых і сэрвісных арганізацыяў. Генэральная мэта кампаніі — захаваць вядучае становішча ў нафтавай прамысловасьці Расіі й увайсьці ў групу сусьветных нафтавых лідараў. Асноўным шляхам пашырэньня сваёй магутнасьці кампанія ўважае набыцьцё буйных пакетаў акцыяў нафтахімічных прадпрыемстваў у краінах СНД, у прыватнасьці ў Беларусі. Кампанія аддае перавагу прадпрыемствам зь пераважна кароткім тэхналягічным цыклем і выкарыстаньнем у якасьці сыравіны нафты “ЛУКОЙЛу”.

У 1992 г. створана замежнае прадпрыемства “ЛУКОЙЛ-Беларусь”. За гэты

час на нафтаперапрацоўчыя заводы Беларусі пастаўлена каля 12 млн. т нафты. У беларускую эканоміку інвэставана больш за 50 млн. дал. ЗША, створана больш за 500 працоўных месцаў. Па выніках 2000 г. у дзяржаўны бюджэт пералічана больш за 7,5 млн. дал. ЗША ў якасьці падаткаў. Замежнае прадпрыемства "ЛУКОЙЛ-Беларусь" эксплюатуе ў краіне 19 аўтазапраўных станцыяў і 3 нафтабазы. Працуе 5 даччыных кампаніяў — "ЛУКОЙЛ-Горадня", "ЛУКОЙЛ-Валожын", "ЛУКОЙЛ-Буг", "ЛУКОЙЛ-Магілёў", "ЛУКОЙЛ-Дняпро".

У 1993 г. кампанію прызналі каардынатарам паставак нафты на "Нафтан". Аднак ужо ў наступным годзе яна адмовілася ад гэтага. Кіраўніцтва гэтай расійскай кампаніі і ўрад Беларусі па-рознаму трактавалі палажэньні "пра гарантаваныя падатковыя льготы".

Прыкладам посьпеху расійскага капіталу на беларускім рынку ёсьць расійска-беларуская транснацыянальная нафтагазавая кампанія "Слаўнафта", створаная ў 1994 г. "Слаўнафта" рэалізуе найбуйнейшы інвэстыцыйны праект на Мазырскім НПЗ і ёсьць каардынатарам паставак нафты на яго. Кампаніі належыць 42,5% акцыяў заводу. Мазырскі НПЗ — адзінае акцыянаванае прадпрыемства ў беларускім энэргетычным комплексе. Апроч "Слаўнафты" ягонымі акцыянэрамі ёсьць дзяржава — 42,7% акцыяў — і фізычныя асобы — 14,8%. Як акцыянэрнае таварыства НПЗ значна пашырыў магчымасьці прыцягненьня ў рэканструкцыю інвэстыцыяў і ўдзельнічаў у стварэньні ў канцы 1994 году беларуска-расійскай нафтавай кампаніі "Слаўнафта". Кожны з чатырох этапаў будучай мадэрнізацыі ўяўляў сабой закончаны праект, пасьля рэалізацыі якога быў наладжаны выраб сыравіны для наступнага рэканструяванага ці будаванага аб'екту і, найважнейшае, быў павялічаны выраб сьветлых ці новых відаў нафтапрадуктаў.

Заданьнем першага этапу была мадэрнізацыя наяўных магутнасьцяў комплексаў ЛК-6У, і яе скончылі ў красавіку 1998 году. Паралельна ішлі работы другога этапу, завершанага ўлетку 2000 году. У часе ажыцьцяўленьня рэканструкцыі прыкметна зьмянялася структура выраблянай прадукцыі й суадносіны паміж асобнымі пазыцыямі асартымэнту. Зьніжаецца доля бэнзіну А-76 і павялічваецца выпуск высокаактанавых бэнзынаў А-92 і АІ-95. Калі ў 1996 годзе вытворчасьць апошніх складала 26% ад агульнага аб'ёму, то ў 1998—1999 гадох іх доля склала больш за 50%. Усё дызэльнае паліва завод ужо сёньня можа выпрабляць з утрыманьнем серкі ня больш за 0,035%, а хутка і 0,005%, у той час як у Расіі збольшага выпрабляецца дызэльнае паліва з утрыманьнем серкі 0,2% і вышэй. А ў заходнеэўрапейскіх краінах, ЗША, Японіі такая марка бэнзыну, як наш А-76, наагул не выпрабляецца, а дызэльнае паліва з утрыманьнем

Табліца 1. Статыстыка выхаду сьветлых нафтапрадуктаў і глыбіні перапрацоўкі на ААТ "Мазырскі НПЗ"

| | *1996* | *1997* | *1998* | *1999* | *2000* |
|---|---|---|---|---|---|
| Выхад сьветлых нафтапрадуктаў % | 48,2 | 50,5 | 54,7 | 49,5 | 50,8 |
| Глыбіня, % | 56,96 | 61,3 | 62,91 | 60,09 | 62,88 |





серкі вышэй за 0,035% ужываць забаронена.

Завершаныя два этапы рэканструкцыі завод правёў за кошт уласных сродкаў і прыцягненьня крэдытаў пад гарантыю ўраду Беларусі. У выніку глыбіня перапрацоўкі нафты ўзрасла з 56,9% до 62,9% (табл. 1). Але найважнейшым і найдаражэйшым будзе 4-ы этап, які прадугледжвае будаўніцтва комплексу каталітычнага крэкінгу коштам 120 мільёнаў даляраў — для Мазырскага НПЗ сума "непад'ёмная".

Праект фінансаваньня разглядаўся на дзяржаўным узроўні з удзелам прэзыдэнта НГК "Слаўнафта" Міхаіла Гуцарыева. У выніку было пастаноўлена: 50% інвэстыцыяў выдзяляе кампанія "Слаўнафта" і столькі ж — беларускі бок, канцэрн "Белнафтахім", ягоныя прадпрыемствы, у тым ліку і РУП "ВА "Беларуснафта". Апрача таго, НГК "Слаўнафта" ўклала пагадненьне з адным зь нямецкіх банкаў на атрыманьне крэдыту, які мяркуецца накіраваць на куплю абсталяваньня, якое не выпрабляюць у краінах СНД.

Заканчэньне будаўніцтва каталітычнага крэкінгу плянуецца на верасень 2003-га году. Сыравінай для комплексу стане беларуская мазута і гідраачышчаны вакуумны газойль, атрыманы з расійскіх нафтаў. Каталітычны крэкінг дасьць магчымасьць выпрабляць прапан-прапіленавую і бутан-бутыленавую фракцыі й атрымліваць экалягічна чыстыя кампанэнты аўтабэнзыну і прадукты нафтахіміі. З уводам яго ў эксплюатацыю павысіцца выхад сьветлых нафтапрадуктаў за кошт перапрацоўкі цяжкіх нафтавых фракцыяў, палепшыцца якасьць тварнай прадукцыі і зьнізіцца ейны сабекошт. На Мазырскім НПЗ будзе выпрабляцца больш за 2 мільёны тон таварнага бэнзыну, амаль утрая павялічыцца выпуск бэнзыну А-92, больш як у чатыры разы — АІ-95. Утрая зьменшыцца вытворчасьць бэнзыну А-76, выпуск якога будзе рэгулявацца патрэбамі народнай гаспадаркі. Сярэдняя глыбіня перапрацоўкі нафты дасягне 80%. У той жа час глыбіня перапрацоўкі нафты, якую здабывае "ВА "Беларуснафта", складзе 85%. Зь яе мяркуецца атрымліваць да 750 тысячаў тон аўтабэнзынаў, што складае 70% ад унутранай патрэбы краіны.

Увод у дзеяньне ўстаноўкі каталітычнага крэкінгу зробіць ААТ "Мазырскі НПЗ" адным з самых перадавых нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў Усходняй Эўропы. Сусьветная практыка сьведчыць, што НПЗ з такімі комплексамі могуць атрымліваць дадатковы прыбытак у памеры 5—8 даляраў на кожнай тоне перапрацаванай нафты.

Замарожваньне працэсу прыватызацыі РУП ВА "Нафтан" мела вынікам тое, што ў цяперашні час завод, вытворчы патэнцыял якога ўдвая большы за Мазырскі НПЗ, нашмат адстае ад апошняга ў мадэрнізацыі. На прадпрыемстве даўно распрацавана інвэстыцыйная праграма, якая ўлучае 15 узаемазьвязаных праектаў, распрацаваных па міжнароднай мэтодыцы. Аб'ём сродкаў, неабходных для выхаду на заходнеэўрапейскі ўзровень перапрацоўкі нафты, згодна з ацэнкай экспэртаў, складае ня менш за 280 млн. дал. ЗША. Пры ўмове, што завод будзе ажыцьцяўляць рэканструкцыю ўласнымі сіламі, яна можа зацягнуцца, і да завяршальнага этапу вытворчасьць усё адно маральна перастарэе. Надаць ды-

намізм працэсу мадэрнізацыі можна толькі пры дапамозе замежнага капіталу. Пры гэтым існуюць тры шляхі:

першы — інвэставаньне ў куплю новых тэхналёгіяў і ўдзел замежнага боку ў пераразьмеркаваньні прыбыткаў ад вырабу і продажу гатовых нафтапрадуктаў;

другі — сумеснае акцыянаваньне прадпрыемства, калі на пачатковым этапе інвэстары выступаюць у якасьці заснавальніка адкрытага акцыянэрнага таварыства;

трэці — стварэньне на пачатковым этапе адкрытага акцыянэрнага таварыства з 100-адсоткавым дзяржаўным капіталам, а на другім этапе — продаж дзяржаўнага пакету стратэгічнаму інвэстару на інвэстыцыйных таргах.

Першая спроба акцыянаваньня ВА "Нафтан" была зробленая ў 1995 г., калі паміж урадамі Расіі й Беларусі было падпісанае "Пагадненьне пра развой узаемавыгаднага супрацоўніцтва ў пастаўцы, перапрацоўцы нафты і рэканструкцыі ВА "Нафтан" з удзелам суб'ектаў гаспадараньня Рэспублікі Беларусі й Расійскай Фэдэрацыі". Меркавалася, што "Нафтан" будзе акцыянаваны, а кантрольны пакет акцыяў перададзены ў кіраваньне на 7 год сумеснаму беларуска-расійскаму прадпрыемству "Расбелнафта", якое й стане фінансаваць будаўніцтва ўстаноўкі глыбокай перапрацоўкі нафты на заводзе. Рэалізавана гэтае пагадненьне не было, таму што прадастаўленьне заводу ў траст супярэчыла новаму Грамадзянскаму кодэксу Рэспублікі Беларусі.

У 2002 г. мяркуецца чарговая прыватызацыя "Нафтану". Актывізацыя гэтага працэсу зь беларускага боку абумоўлена абвостраным дэфіцытам дзяржаўнана бюджэту. Расійскія прадаўцы нафты зацікаўленыя ў павелічэньні аб'ёму паставак нафты ў Беларусь, паколькі паабяцалі краінам OPEC скараціць экспарт нафты ў індустрыяльна разьвітыя краіны сьвету. Канкурэнцыя ўзьнікла паміж НГК "Слаўнафта", "Сургутнафтагазам", "ЛУКОЙЛам" і групай "Ітэра", прычым "Слаўнафта" заявіла аб сваім жаданьні ўзяць удзел у рэалізацыі інвэстыцыйных праектаў у галіне нафтахіміі ў тандэме з "Сургутнафтагазам".

Альянс "Слаўнафты" з "Сургутнафтагазам" не выпадковы — на расійскім рынку ў кампаніяў скаліся партнэрскія адносіны. У прыватнасьці, "Сургутнафтагаз" прадае "Слаўнафце" штогод на ўнутраным рынку да 1,5 млн. т сваіх лішкаў нафты. Калі "Сургутнафтагаз" ня мае досьведу ў рэалізацыі інвэстыцыйных праектаў у Беларусі (кампанія была й ёсьць фаварытам у сфэры паставак нафты), дык ён ёсьць у "Слаўнафты".

Адной з найбольш складаных праблем у гэтым акцыянаваньні ёсьць пытаньне ацэнкі кошту прадпрыемстваў. У Расіі ацэнка грунтуецца не на балянсавым кошце, як практыкуецца ў Беларусі, а зыходзячы з рынкавых падыходаў — на кошце бізнэсу.

Паважнай перашкодай расійскаму капіталу ў прыватызацыі "Нафтану" можа стаць і іншая праблема: калі беларускі бок будзе настойваць на акцыянаваньні





ўсяго паўночнага "куста" прадпрыемстваў — "Нафтану", "Паліміру" і Навапалацкай ЦЭЦ — у рамках меркаванага холдынгу. Ідэю ўваходжаньня ў паўночны "куст" прапанавала беларускаму ўраду "Ітэра". Пакуль беларускі бок не прыйшоў да нейкай пэўнай думкі, што ствараць на базе трох прадпрыемстваў — адно ўнітарнае ці холдынг. Улічваючы, што зь юрыдычнага пункту гледжаньня падобнага кшталту аб'яднаньні для беларусаў будуць прэцэдэнтам, наўрад ці выйдзе зрабіць гэта хутка. Да таго ж, акцыянаваньне адным "пакетам" зьніжае колькасьць патэнцыйных пакупнікоў.

Улічваючы вышэйменаванае, верагодна, што беларускі бок схіляецца на карысьць трэцяга шляху.

З 2002 г. у Рэспубліцы Беларусі пачала працаваць яшчэ адна камэрцыйная замежная арганізацыя — "ТНК Белнафта", створаная на базе прадстаўніцтва Цюменскай нафтавай кампаніі ў краіне. Чакаецца, што ў 2002 г. яна паставіць у Беларусь каля 1 млн. т нафты. Аднак працаваць на нафтавым рынку краіны ёй будзе цяжка, бо апошнім часам на ім вуглевадароднай сыравіны дастаткова.

Існуюць магчымасьці расійска-беларускага супрацоўніцтва ў сумеснай выведцы і асваеньні радовішчаў арганічнага паліва. Мэханізм удзелу Беларусі ў асваеньні расійскіх нетраў дапускае два варыянты: набыцьцё ліцэнзіяў на распрацоўку радовішчаў або сумеснае разрабленьне зь іншымі замежнымі фірмамі. Цяпер ствараецца Нянецка-беларуская кампанія. Зь беларускага боку яе заснавальнікамі выступаюць канцэрн "Белнафтахім" і вытворчае аб'яднаньне "Беларуснафта", з расійскага — Нянецкая нафтавая кампанія. Вядома, што абодва бакі будуць мець роўныя долі ў стваранай кампаніі.

Паводле некаторых ацэнак, "Беларуснафта" штогод можа ўкладаць у разрабленьне нафтавага радовішча ў Расіі да 1,5—2 млн. даляраў ЗША. Не выключаецца таксама прыцягненьне крэдытных сродкаў, у выніку інвэстыцыі могуць скласьці 50—100 млн. даляраў ЗША. Паводле некаторых ацэнак, меркаваны рэгіён разрабленьня радовішча даволі пэрспэктыўны. Аднак трапіць у "абойму" фірмаў, якія прэтэндуюць на разрабленьне пакладаў нафты, не зусім проста. Напрыклад, "ЛУКОЙЛ" карэктна папярэдзіў "Беларуснафту" аб сваіх інтарэсах у гэтым рэгіёне. Пасьля рэгістрацыі Нянецка-беларускай нафтавай кампаніі ёй неабходна яшчэ атрымаць ліцэнзію на геалягічную выведку нетраў Нянецкай аўтаномнай акругі і здабычу нафты, а таксама выйграць тэндэр. Толькі пасьля гэтага можна пачаць сумеснае разрабленьне радовішча.

Неаднойчы абвяшчалася, што інтэграцыйным ядром паліўна-энэргетычнага комплексу Расіі й Беларусі ёсьць электраэнэргетыка. Аднак акурат тут няма паразуменьня паміж двума манапалістамі: РАТ "ЕЭС России" і канцэрнам "Белэнэрга". Пагадненьне паміж беларускім і расійскім урадам пра стварэньне адзінай энэргетычнай сыстэмы было ўкладзенае яшчэ ў 1999 г., а стварыць саму сыстэму плянавалася ў 2001 г. Асноўнай перашкодай для аб'яднанай энэргетычнай сыстэмы "Саюзнай дзяржавы" сталася марудлае рэфармаваньне электраэ-

нэргетыкі ў самой Расіі й адсутнасьць усялякага рэфармаваньня электраэнэргетычнай галіны ў Беларусі, а таксама адсутнасьць адзінай цэнавай і тарыфнай палітыкі на энэрганосьбіты. Улічваючы, што кантрольны пакет акцыяў у РАТ “ЕЭС России” належыць дзяржаве, а прадпрыемствы канцэрну “Белэнэрга”, якія забясьпечваюць вытворчасьць і разьмеркаваньне электрычнай і цеплавой энэргіі, ёсьць цалкам дзяржаўнай уласнасьцю, стварыць такую сыстэму цяперашнім часам ня можна. Для прыцягненьня расійскага капіталу ў электраэнэргетыку беларускі бок павінен (па ўмове расійскага боку) ажыцьцявіць акцыянаваньне прадпрыемстваў, што створыць канкурэнтны рынак паміж вытворцамі электрычнай і цеплавой энэргіі і паміж яе прадаўцамі. Як будзе дзеяць нядаўна створанае Міністэрства энэргетыкі Рэспублікі Беларусі, у падначаленьні якога цяпер знаходзіцца канцэрн “Белэнэрга” і ў функцыі якога ўваходзіць выбар шляху і спосаб ажыцьцяўленьня структурнай перабудовы энэргасыстэмы, прадказаць цяжка.

Больш інтэнсіўна супрацоўнічае з расійскім капіталам беларускае дзяржаўнае прадпрыемства “Белтрансгаз”, якое ёсьць натуральным манапалістам і забясьпечвае транзыт расійскага прыроднага газу ў Эўропу і пастаўку яго ў Беларусь. Да 1997 г. пастаўкі газу ў краіну ішлі толькі на аснове дамоваў з РАТ “Газпрам”. На пачатку 1998 г. у сувязі са скарачэньнем “Газпрамам” паставак газу ў краіну з прычыны неаплаты бягучага спажываньня і нарастаньня запазычанасьці ДП “Белтрансгаз” занялося пошукам альтэрнатыўных пастаўнікоў “блакітнага” паліва, здольных кампэнсаваць скарачэньне паставак з боку расійскага манапаліста. Такім пастаўніком стала даччынае прадпрыемства “Газпраму” міжнародная група кампаніяў “Ітэра”.

Сьпярша жаданьне прыватнай, да таго ж замежнай кампаніі пастаўляць у Беларусь газ было сустрэта Лукашэнкавай адміністрацыяй зь вялікім недаверам. У той час багата фірмаў працавалі ў энэргетычным сэктары, аднак іхная дзейнасьць зводзілася да так званых энэргазалікаў. Выкуплялася частка беларускай запазычанасьці ў “Газпраму”, а на суму гэтай запазычанасьці фірмы атрымлівалі ліквідную прадукцыю беларускіх прадпрыемстваў. У адрозьненьне ад іх “Ітэра” ужо цягам чатырох гадоў стабільна пастаўляе прыродны газ у краіну.

У гэты момант амаль чвэрць паставак прыроднага газу ў краіну прыпадае на долю “Ітэры”. Пры гэтым “Ітэра” пастаўляе газ на беларускія прадпрыемствы без пасярэдніцтва “Белтрансгазу” (“Белтрансгаз” атрымлівае грошы толькі за транзыт), што дадатна адбіваецца на кошце газу для беларускіх спажыўцоў. Галоўным сродкам разьліку за газ выступаюць беларускія тавары, дзякуючы чаму Беларусь ужо атрымала магчымасьць выйсьці на расійскі, сярэднеазіяцкі рынкі і ўва ўсе рэгіёны, у якіх працуе “Ітэра”. “Газпрам” увесь час патрабуе павялічыць долю аплаты за газ грашыма, а “Ітэра” гатовая працаваць з прадпрыемствамі па ранейшых таварных схемах. Апрача таго, “Ітэра” пры няўплатах прэтэнзіяў не выстаўляе, бо самастойна вызначае, калі, якую прадукцыю і па якім кошце браць.





Што да інвэстыцыйных праектаў “Ітеры”, то найбольш значным зь іх можна назваць рэканструкцыю ВА “Нафтан”. Спэктар інвэстыцыйных інтарэсаў кампаніі ў краіне ўлучае жыльлёвае будаўніцтва, разьвіцьцё аграпрамысловага комплексу і шэраг іншых кірункаў народнагаспадарчай дзейнасьці. Агулам жа група “Ітэра” мяркуе ўкласьці ў эканоміку Беларусі інвэстыцыяў у памеры 30 млн. даляраў ЗША.

Улічваючы, што нафта і газ былі й застаюцца адным з найважнейшых энэргетычных і экспартных рэсурсаў Расійскай Фэдэрацыі, сродкам уплыву на сытуацыю ў рэгіёнах, у якіх яна мае геапалітычны інтарэс, расійскі капітал будзе заўсёдна шукаць і прапаноўваць новыя формы інтэграцыі з паліўна-энэргетычным комплексам Беларусі.